основателя советской анестезиологии И.Жорова, поэтов А.Пысина и И.Шкляревского и др. являются примером для нового поколения граждан. Бывали в городе знаменитые писатели, общественно-политические деятели, представители культуры: А.С. Пушкин, Т.Г. Шевченко, Н.В. Гоголь, В.Г. Короленко, С. Есенин, Ф. Шаляпин и пр. [2]

Гордость за мужество и героизм предков, их стремление не покориться врагу и, вопреки разрушениям, творить на благо людей, формируются при изучении тем: Могилёв во время войн России и Речи Посполитой, национально-освободительного восстания 1661 года, город во время Северной войны, войны 1812 года, в годы Первой мировой войны (с 8.08.15 г. по 26.02.18 г. в Могилёве размещалась Ставка Верховного Главнокомандующего и жил последний Российский император Николай II) и революционных лихолетий. [1]

Особое место занимают события 1941 года. Когда на пути врага – гитлеровских захватчиков, встал Могилёв. Он не имел специальных оборонительных сооружений, но смог 24 дня сдерживать врага. Третий этап обороны города начался 16 июля – в этот день гитлеровцы заняли правобережную часть Смоленска! Впервые в годы войны, именно в Могилёве, было сформировано народное ополчение, впервые за одни сутки на Буйническом поле (окраина города) подбили 39 вражеских танков. Всё это подробно описано в трилогии К.Симонова «Живые и мёртвые». Прах писателя, после его смерти в 1979 году, был развеян на Буйническом поле. В 1999 – 2005 гг. на месте героических боёв под Могилёвом сооружён мемориальный комплекс.

Ответственность за судьбы людей и страны воспитывает материал из жизни Могилёва в 1920–30-е годы. Противоречивость этого периода – трудовой энтузиазм в годы индустриализации и одновременно репрессии, ликвидация храмов, попытки переименования города, проект переноса столицы БССР из Минска в Могилёв, всё это позволяет формировать ответственность и взвешенность при принятии решений на современном этапе развития общества, видеть перспективы развития Могилёва. Это актуально в условиях необходимости преумножения социально-экономичного потенциала города, развития демократии, решения экологических проблем и одновременного сохранения памятников истории и культуры.

Дисциплина «Историческое и культурное наследие г. Могилёва» полностью обеспечена учебно-методическими пособиями (издан курс лекций, рекомендации к планам семинарских занятий и т.д.), разработан и внедрён в учебный процесс курс лекций в формате презентации, созданный на основе программы Power Point.

Список использованных источников

1. Курков, И.Н. Могилёвщина: легенды, события, люди / И.Н.Курков, И.А.Пушкин. – Минск: Медиафакт, 2008. – 368 с.
2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілёва / Беларус. Энцыкл.; Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1998. – 496 с.
3. Пушкін, І.А. Гістарычная і культурная спадчына горада Магілёва: Курс лекцый / І.А.Пушкін. – Магілёў: УА "МДУХ", 2006. – 150 с.
4. Пушкин, И.А. Исторический очерк создания и деятельности Могилёвского государственного университета продовольствия / И.А.Пушкин // 35 лет Могилёвскому государственному университету продовольствия / редкол.; В.А.Шаршунов (пред.). – Минск: Изд.центр БГУ, 2009. – С. 2 – 53.
5. Pushkin, I. Arhitectural heritage of Mogilev region (Eastern Belarus) // Pamatkova pŭce v občanskŭ společnosti. Sbornik conference (18-20 dubna 2007, Zamek Rosice u Brna). – Brno: Občanskŭ sdruženi Polypeje, 2007. – S. 20

УДК 37.035.6:378

## ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ СРОДКАМІ КРАЯЗНАЎСТВА

***Г.Г. Рамановіч***

***Расійскі дзяржаўны сацыяльны універстітэт (філіял у Мінску), г. Мінск, Рэспубліка Беларусь***

Праблеме патрыятычнага выхавання сучаснай моладзі ўдзяляецца даволі шмат увагі.

Над вырашэннем гэтай праблемы працуюць як інстытуты, якія згодна з іх прававым статусам, павінны займацца выхаваннем, у тым ліку і патрыятычным, так і моладзевыя арганізацыі краіны. У

апошнія гады ў гэтым накірунку зроблены значныя крокі наперад. Так, па беларускаму радыё ўсе часцей і часцей гучыць беларуская мова, паэты пішуць песні, а спевакі выконваюць іх на мове тытульнай нацыі, але яшчэ больш неабходна зрабіць для таго, каб з сучаснага маладога чалавека выхаваць сапраўднага патрыёта.

Галоўнае, на што трэба звярнуць увагу ўсіх тых, хто свядома займаецца выхаваннем, гэта фармаванне разумення, што важнейшай ідэнтыфікацыйнай прыкметай нацыі з'яўляецца мова (у данным выпадку-беларуская). Свабоднае валоданне ёю, веданне гісторыі і літаратуры, культуры свайго краю – гэта абавязковыя першасныя складнікі выхавання патрыятызма ў грамадзян. Не ўсё яшчэ зроблена ў гэтым накірунку. Каналы беларускага тэлебачання, напрыклад, амаль цалкам рускамоўныя і змест тэлепраграм, якія дэманструюцца на іх, цяжка адрозніць ад расійскіх тэлеперадач. Выключэнне складаюць краязнаўчая тэлеперадача “Падарожжы дылетанта”, “Тэлебарометр” ды некалькі іншых. Большасць дыктараў, відаць, таксама не ў поўнай ступені валодаюць дзяржаўнаю беларускаю моваю: напрыклад, вымаўляюць беларускія словы з рускамоўным гучаннем. Ёсць шэраг агульнаадукацыйных школ у якіх не ўбачыш ні воднага слова на беларускай мове ў матэрыялах нагляднага афармлення навучальнай установы (у планах работы, раскладзе заняткаў, насценных газетах ды інш.), служачыя большасці розных устаноў не могуць выкарыстоўваць беларускую мову нават тады, калі на ёй да іх звяртаецца наведвальнік. Вельмі рэдкая з’ява, калі асобы з розным сацыяльным статусам даюць інтэрв’ю на беларускай мове. Усё гэта не спрыяе фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці і паўнавартаснаму патрыятычнаму выхаванню маладога пакалення.

Адным з найбольш цікавых і перспектыўных сродкаў патрыятычнага выхавання, які можа рэалізаваць прафсаюзная, ці моладзевая арганізацыі – гэта іх удзел у краязнаўчых экспедыцыях, турыстычных вандроўках па роднаму краю. Вучоныя сацыёлагі сцвярджаюць, што выкарыстанне ў выхаваўчай рабоце памятных месцаў краіны заўсёды ўзмацняе псіхалагічнае пачуццё супольнай ідэнтычнасці, што спрыяе кансалідацыі нацыі. Такіх памятных месцаў у нашай краіне вялікая колькасць.

У навучальных установах для рэалізацыі гэтай важнай мэты недастаткова выкарыстоўваюцца матэрыялы аб жыцці і дзейнасці нашага земляка Адама Міцкевіча і падарожжы па яго мясцінах.

У мэтах актыўнага выкарыстання такой формы работы лічу неабходным коратка, у межах дадзенай работы, пазнаёміць студэнтаў, арганізатараў выхаваўчай работы, лідэраў моладзевых арганізацый з матэрыяламі, якія могуць служыць першапачатковымі арыенцірамі для больш поўнага апавядання аб вялікім патрыёце нашай бацькаўшчыны – Адаме Міцкевічы.

Адам Міцкевіч для беларусаў - гэта тая самая вялічыня, якой з’яўляецца для для грузінаў- Ш. Руставелі, рускіх- А.С.Пушкін, украінцаў-Т.Р. Шаўчэнка. Уся яго творчасць, ад ранніх рамантычных балад да фундаментальных твораў, прасякнута глыбокім патрыятызмам.

> Літва! Бацькоўскі край, ты як здароў’е тое:
> Не цэнім маючы, а страцім залатое -
> Шкада, як і красы твае, мой родны краю.
> Тугою па табе тут вобраз твой складаю [1.-с.7].

Жыццё і творчасць А.Міцкевіча непарыўна звязана з Наваградкам і яго ваколіцамі. Там ён нарадзіўся, там прайшло яго дзяцінства, тыя мясціны натхнялі паэта на творчасць.

Нарадзіўся паэт 24 снежня 1798 года, па адной з версій, на хутары Завоссе непадалеку ад вескі Колдычава размешчанай на шашы Баранавічы - Наваградак. Да 200- угодкаў паэта там быў адбудаваны комплекс- сядзіба.

Наступным і вельмі важным месцам, звязаным з жыццём і творчасцю А.Міцкевіча, з’яўляецца возера Свіцязь. Гэтаму цудоўнаму кутку нашай Радзімы паэт прысвяціў балады «Свіцязь», «Свіцязянка», «Рыбка»(1820-1821г.г.) ды іншыя.

Паэт часта быў ля возера, хадзіў па дарожцы вакол яго. Тутэйшыя рыбакі расказвалі яму старажытныя паданні. Адпачываў на яго берагах (паводле польскага журнала “ Zemia” кожны з берагоў возера Свіцязь меў сваю назву: карэліцкі, каралеўскі і г.д.) і працаваў ля вялікага дуба, рэшткі якога засталіся на тэрыторыі сучаснай аздараўленчай установы.

Прыблізна у 20 кіламетрах ад возера знаходзіўся парк і маентак Туганавічы. Там паэт сустрэў сваё рамантычнае каханне - Марылю Верашчака.

Непадалеку ад парка ў Туганавічах (веска Карчова) ляжыць вялікі камень, які называецца «Камень Філарэтаў». Каля яго А.Міцкевіч сустракаўся з Янам Чачотам, Тамашам Занам, Ігнатам Дамейкам і іншымі блізкімі па духу людзьмі, якія марылі аб свабодзе і незалежнасці сваёй радзімы.

Наваградак займае асаблівае месца ў жыцці паэта. Гэты горад можна назваць цэнтрам беларускіх дарог Адама Міцкевіча.

У Фарным касцеле 12 лютага 1799 года яго ахрысцілі. У бакавым алтары касцёла знаходзіцца абраз Божай Маці з Дзіцяткам. Гэта копія абраза, перад якім малілася маці Адама Міцкевіча просячы Божай ласкі захаваць жыццё маленькаму Адаму.

З біяграфічных матэрыялаў вядома, што ў дзяцінстве Адам вываліўся з вакна (ёсць і іншыя версіі). У непрытомным стане прынясла яго маці ў фарны касцёл і доўга малілася перад абразам Божай Маці Наваградскай, просячы здароў'я свайму сыну.

О ты, заступніца прачыстая над намі,
Чый цудатворны лік у Чанстахове ў храме,
І ў Вострай Браме свяціцца пры набажэнстве,
І ў Навагрудку замкавым! Як мне ў маленстве
Жыццё вярнула ты, з'явіўшы цуд нябесны
(Сынок на свет зірнуў, і маці стогн балесны
Спыніла, модлы ўзносячы праз слезы богу...)[1.- с.7].

Пад уплывам маці паэт сфарміраваўся вельмі рэлігійным чалавекам.

У 1806 годзе ў Наваградку быў пабудаваны дом, у якім жыла яго сям'я. У 1992 годзе сядзіба Міцкевіча была ў чарговы раз рэстаўравана і зараз там размешчаны музей Адама Міцкевіча*.

З Наваградка пачынаецца шлях юнака Міцкевіча ў навуку ў Віленскі ўніверсітэт, у палітыку, у барацьбу за свабоду сваей Бацькаўшчыны. Знаходзячыся ў выгнанні ў Парыжы паэт не толькі не забывае пра сваю Радзіму, але і піша ей велічныя гімны - паэму «Пан Тадэвуш», і , стаўшае хрыстаматыйным, выказванне пра беларускую мову.

"На беларускай мове, якую называюць русінскай альбо літоўска-русінскай, таксама размаўляе каля дзесяці мільёнаў чалавек; гэта самая багатая і самая чыстая гаворка, якая ўзнікла даўно і выдатна распрацавана. У перыяд незалежнасці Літвы вялікія князі карысталіся ёю для сваей дыпламатычнай перапіскі"[ 4.- с.122].

У 1924 - 1931 гадах у Наваградку, на Малым Замку, быў насыпаны Курган памяці Адама Міцкевіча (Курган бяссмерцця), а ў сучасныя гады там жа пабудаваны велічны помнік паэту, аўтарам якога з'яўляецца скульптар Янушкевіч.

Непадалёку ад Наваградка, у прыгожым месцы, знаходзіцца возера Літоўка, якое таксама апетае Адамам Міцкевічам у сваіх творах, а далей, калі ехаць у бок Нёмана праз Нягневічы, палягае веска Шчорсы з багатай, у былым, бібліятэкай, заснаванай графам Храптовічам, чалавекам вельмі адукаваным, які любіў навуку, а яшчэ больш любіў сваю Айчыну. У гэтай бібліятэцы працаваў А.Міцкевіч, збіраліся філаматы.

Да нядаўняга часу ў Шчорсах быў дуб Міцкевіча, скаваны жалезнымі ланцугамі для таго, каб захаваць яго ад разбурэння, але гады робяць сваё...

Калі пачатак рамантычнага кахання Адама Міцкевіча да Марылі Верашчака ўзыходзіць у Туганавічы, то трагічная развязка гэтых адносін адбылася нападалеку ад вескі Беняконі Гродзенскай вобласці. Там, у Бальценіках жыла яго каханая, якая ў той час ужо была жонкай вядомага ў акрузе чалавека, графа Путкамера. Памяць свайго сэрца- каханне да Марылі Верашчака аўтар апісаў у наступных радках:

Precz z moich oczu!.. posłucham od razu,
Przech z mego serca!.. i serce posłucha,
Przech z mej pamęci.. nie - tego roskazu
Moia i twoja pamięc nie posłucha" [ 2 .-с.50].

У 1833 годзе, пасля задушэння расійскімі войскамі паўстання, граф і яго жонка былі арыштаваны царскімі ўладамі.

На невялічкіх прыкасцельных могілках стаіць помнік, надпіс на якім паведамляе, што 28 снежня 1863 года адышла з зямнога жыцця Марыля Верашчака.

Наша Радзіма дала свету многа вядомых прозвішчаў. Вучоны-этнограф і гісторык А.К.Кіркор, які даследаваў Літоўскае Палессе, у сваёй працы ў 1882 годзе, пісаў: "Лучшие знаменитейшие люди на

всех поприщах в период трехвековой общей исторической судьбы, большей частью были из уроженцев Литвы и Белоруссии. Достаточно вспомнить, хотя из последних времен, имена Костюшки (уроженца Гродненской губ.), Рейтана (Минская губ.), Нарушевича (Пинского уезда), Немцевича (Гродненская губ.), Мицкевича (Новогрудского уезда), Крашевского (Гродненская губ.)"[3. - с.136].

*У Варшаве знаходзіцца музей імя А. Міцкевіча

Аб адным, таксама мала вядомым беларусам героі, расказвае і А.Міцкевіч у вершы "Смерць палкоўніка". Верш апавядае пра тое, як пасля крывавай бітвы з ворагам, у якой загінуў іх камандзір, паўстанцы назаўсёды разіталіся з ім.

Ды чаму твар дзявочы у байца? Два грудкі...
Хто ж мог знаць, што баеў завадатар,
Быў... дзяўчынай! Была - слез не трэба, жанкі,-
То ліцвінка Эмілія Плятэр! [2.-с.342; 4.-с. 102].

Эмілія Плятэр - гераіня паўстання 1830 - 1831 гадоў. Нарадзілася яна ў 1806 годзе ў Вільні. Жыла з маткай у тагачаснай весцы Лісна Віцебскай губерні. Пісала вершы, цікавілася фалькларыстыкай. Калі пачалося паўстанне, яна пераапранулася ў адзенне юнака, сабрала значны па колькасці атрад паўстанцаў і прымала ўдзел у самых цяжкіх баях з царскімі карнікамі. Загінула беларуская Жана д 'Арк 23 снежня 1831 года.

Гэтыя імены - гонар нашай Бацькаўшчыны і яны павінны стаць шырока вядомымі беларусам.

Амаль у кожнай хатняй бібліятэцы сучаснага жыхара Беларусі есць томік выбраных твораў А.С Пушкіна, шмат у якіх семьях можна знайсці творы Я.Купалы і Я.Коласа і зусім у нямногіх есць хаця б невялічкія звесткі аб жыцці і творчасці нашага слыннага земляка, сусветна вядомага паэта і грамадзяніна Адама Міцкевіча.

А.Міцкевіч як паэт, як патрыёт нашай Бацькаўшчыны, яшчэ далека не поўнасцю вядомы кожнаму беларусу. У знаемстве з палітычнымі поглядамі знакамітага сына зямлі наваградскай, з яго бессмяротнай творчасцю, ляжыць адзін з перспектыўных шляхоў патрыятычнага выхавання сучаснай беларускай моладзі.

Выкарыстаная літаратура:


1. Міцкевіч, А. Пан Тадэвуш / А. Міцкевіч. Мн., 1975.
2. Mickiewicz, A. Poezje / A. Mickiewicz. Wilnius,1955.
3. Киркор, А.К. Просвещение и народное творчество в Литве // Живописная Россия. Литовское и Белорусское Полесье / А.К. Киркор. Мн., 1993.
4. Філаматы і філарэты. Зборнік. Мн., 1998.


УДК 378.18:37.017.4

## ИДЕОЛОГИЧЕСКИЕ ОСНОВЫ ВНЕУЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ В ВУЗЕ

*Л.В. Вишневецкая*

*УО «БТЭУПК», г. Гомель, Республика Беларусь*

В условиях современного высшего образования и развития белорусского общества идеологическая и воспитательная работа со студенческой молодежью предоставляет широкие возможности создания базиса личности социально активной, инициативной, умеющей противостоять чуждым идеям и асоциальным проявлениям. Целью идеологической и воспитательной работы в вузе является привитие молодым людям основополагающих ценностей, идей и убеждений, отражающих сущность белорусской государственности и содействие формированию активной гражданской и личной позиции молодежи в становлении сильного авторитетного государства [1, с.4].

Основными задачами идеологической и воспитательной работы со студенческой молодёжью выступают:

- координация взаимодействия субъектов учебно-воспитательного процесса (преподавателей, кураторов, воспитателей, студентов, представителей общественных молодежных организаций, семьи) по обеспечению условий для создания эффективной идеологической и воспитательной работы в вузе;